Цэна асобнага нумэру 5 кап

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: **Вільня, Віленская вул., № 29.**

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцай: на 1 г.— 4 р. на 6 мес.—2 р. 3 мес.—1 р. Перамена адрэсу— 20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспандэнцыі, прысланые у рэдакцыю, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ падпісаць прозвішчэ разам з фаміліей,, хто ня захочэ каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакцыі. Рэдакція пакдае за сабой права папраўляць і укарачываць прысланые рукапісы і аўторам назад іх не звертае.

Год IX. 12 Чэрвеня 1914 г. № 23

Просімо п. п. Падпісчыкоў „Нашай Нівы“, каторые падпісаліся толькі на першую палавіну 1914 г., чым хутчэй аднавіць падпіску, каб не было перарыву у высылцы газэты.

## На тэмы дня.

У палітыцы настало ужо звычайнае летняе зацішшэ; - праўда, што ешчэ не распушчэны на летні спачынак вышэйшые гасударственные установы: Гас. Дума і Гас. Рада, але у Думе і бяз роспуску зрабілося пуста. Дэпутаты-- змаркоціўшыся і змарыўшыся, ня гэтулькі працай, колькі дарэмнай таўкатнёй на адным мейсцы—адзін за другім раз'ежджаюцца.

Так яно заўсёды бывае калі, заместа вялікай ідэі, людзі пачынаюць займацца палітыканствам і гандлярствам ідэямі. За ідэю, за вялікую праўду людзі гатовы палажыць нават жыцьцё ў жэртву, а палітыканство і гандлярство ідэямі родзіць нуду, маркоту, пустату ў душы і становіцца людзям цяжка ня толькі працаваць, але і жыць на сьвеці. Найлепшы гэтаго прыклад дае нам зраўненьне першай і чацьвёртай Думы. У першай Думе людзі гарэлі агнём ідэі,— слова сказанае у Думе атклікалося у найдалейшых закутках і варушыло грамадзянство.

Першая Дума не магла працаваць, бо ей не далі.

Чацьвёртая Дума, скліканая па сталыпіноўскаму рэцэпту, злажылася пад знакам інтэрэсоў пануючых станоў: дваранства, чыновенства і духавенства (праваслаўнаго). Вынянчэная адміністраціўнымі агранічэньнямі у часе выбароў, ўскормленая светаглядам Пурышкевіча, каторы з думскай трыбуны павёў прапаганду сыску, —ня можэ працаваць, бо лішне многа у ей крамарскаго, бяз'ідэйнаго.

Дзякуючы агранічэняням у часе выбарў, у Думу трапілі не праўдзівые прэдстаўнікі народу, а тые найболей, што проці волі і долі народнай. Малая жменька левых дэпутатоў патонула у моры саюзніцтва і пурышкевічоўства.

Як у сярдзітую зімку сковывае зямлю зімовы халад і ўсё заміраe, так Расею у цяперэшнім часе скавала рэакція і яе дзікае завываньня чутно у гомане чэлавеканенавісніцтва, гатоваго усё жывое, сьветлае, абагрэваючае душу, задушыць, замарозіць, сцерці... Але як у прыродзе пасьля зімы настае красная весна, так настане калісь весна і ў нашым жыцьці. Дачэкаемся лепшых часоў, бо правы прыроды і правы кіруючые народамі цьвёрды і іх ніякая цёмная сіла пэраламаць ня здужае.

Жывое ажыве і будзе жыць...

А пакуль што трэба працаваць і працаваць, каб зіма не змарозіла душ нашых, каб мы гарачымі і жывымі думамі маглі сустрэціць лепшые часы. *В. Л.*

**Папраўка.** У № № 21—22 «Н.Н.» у канцы стацьці «А ўсё-ж такі жывём» праз недагляд карэктара памылкова надрукавана слова *Копэрнік*; павінна быць—*Галілей*..

## К жыцьцю!

Кожная новая ідэя, кожная новая думка родзіцца заўсёды самім жыцьцём. Паяўляюцца апосталы, каторые цэлай галавой вышэй стаяць ад звычайнаго народнаго імпульса, і пачынаюць шырыць свае вучэньня і пропаведзі.

Апрача ня многіх, ешчэ не даросшые да гэтых думак, людзі с пачатку лічуць новае за нейкае апаганіваньне старых традыцій, за непрыемнае для іх узбурэваньне старога спакою—балота, пакрытаго з верху зялёнай абманчывай цінай і.. прарока распінаюць, як бязбожніка і бунтоўніка, каторы няпрошэны ўлез у іх прысяжную праўду. Жыцьцё ідзець тымчасам сваім ходам і, у канцы-канцоў, тые гарачые, шчырые словы непрызнанаго апостала спаўняюцца...

Аглядаюцца людзі—жыцьцёвая праўда сваім добра загартаваным напорам ўрэзываецца ўсё глыбей і глыбей...

Шэпчуцца людзі:—«Той распяты намі быў сьвяты!.. сьвяты!..»

Народ перэкідаецца ад крайнасьцей да крайнасьцей і с тым самым імпэтам, што раней паганіў, цяпер паважаець свайго прарока жыцьця...

Людзі цалуюць пакорна яго магілу і ставюць яму хвалебные манумэнты...

Людзі каюцца:

— О, чаму мы раней не зразумелі?

— Мы бы дагэтуль шмат чаго большаго зрабілі бы! Мы бы да гэтуль...—і захлёбываюцца новай хваляй навейшаго жыцьця...

І зноў тая самая гісторыя!

І зноў тая самая чэрэпаш'я хадзьба!

У гэтым, ад незапамятных часоў, і ўся трагэдыя жыцьця... Дзела ат Слова заўсёды гранічыцца вялікаю прорваю і доўгі час прыходзіцца чэкаць агульнаго усьведамленьня...

Глаўным мастом паміж словам і дзелам ёсць падгатоўка і ўсьведамленьня народу да новай ідэі у жыцьці.

Але так, як ўсё у жыцьці меняецца, гэтак само жыцьцё меняецца.

Самы тэмп і ход жыцьця ўжо не такі, які быў даўней.

Глаўны нэрв жыцьцёвы зрабіўся вельмі чулы, так, што рахавацца цяпер з устарэлай практыкай нельга.

Цяпер заместа: «Пасьпех — на людзкі сьмех» кажуць: «Аткладне ідзець у лад...» Кожная ідэя павінна адразу дапасавацца да жыцьця.

Жывое жывым і корміцца! Досі нам уздаволівацца пустымі казкамі, прыгожымі славамі!..

Жыцьця, жыцьця дайця нам!..

Гэта належыць да нас беларусоў цяперака... да нашаго руху...

Праўда, уелася гэта сьвятая справа у жыцьці, у мазгах укаранілася... Ўсе,—і тые, каторые спачатку жартавалі,—пачалі цяпер другімі вачамі глядзець на справу. Вельмі добра. Так павінна быць. Але нам цяпер трэба скарэйшым шагам пайсьці у асьветленьні вёскі. Не чэкаць, злажыўшы рукі, а адразу з Дзела пачаць...

Чаго вы маўчыцё, жывые сьвятлейшые людзі нашы?—

Ідзіця да працы! Будуйця будучыну Народу Беларускаму.

Тварыця коопэратыўные установы!

Ніхай селянін папраўдзі болей карысьці маець с працы рук сваіх...

Дзе тые хаўрусные банчкі? Чаму іх гэтак мала?

Ніхай селянін папраўдзі падмогу маець ад шчырых братоў сваіх ..

Дзе тые школы народные? Чаму іх гэтак скупа?

Дзе тые чытальчі, гурткі асьветы, дзе тая жыватворная духоўная страва па вёсках?.

«Ешчэ далёка да таго часу!»—кажэця вы: «Жыцьцё ідзець сваім звычайным парадкам»...

Не, браткі,—жыцьцё да жыцьця ня роўна...

Што раней, а што цяпер — вялікая розніца...

Не, браткі — у вас толькі ёсць занадта духоўнаго гультайства...

Не аставайцеся ззаду—ідзіця разам з Жыцьцём к Жыцяцю!

К таму Жыцьцю, каторае гарыць полымем вялікай Энэргіі, Жыцьце, маючэе у сабе багатые сілы, каторые нібы дынаміт разрываець ўсё старое, заржаўленае, скрыпучае а ладзіць Новае, Чыстае, Гулкае, наадвекі загартаванае жыцьцё!..

Ад Слова да Дзела!

У гэтым глаўная апора і надзея...

Не кажыця, што не патрапіця,—трэба толькі хацець...

Не кажыця—ешчэ пасьпеем.

Кожная хвілінька дарага...

І якая важная работа цяпер стаіць перад вамі, браткі мае!..

Мы спадзеваемся, што тые здаровые элементы вясковаго люду, каторые гадаваліся пад небам і сонейкам не затуленым едкім дымам фабрык і шэрымі гарадзкімі сьценамі, саслужаць у скорасьці вялікую службу.

Гэтые сьвежые народные элементы будуць тымі прышчэпамі, каторымі хутка прыдзецца лечыць выраджаючыеся гарадзкіе пакаленьня, каторые ўжо чуць ногі валочуць пад ціжарам атручэнаго фізычнаго і духоўнаго жыцьця і нездаволеннасьці ва ўсім..

К Жыцьцю!

Дайця народу хлебануць, пакаштаваць толькі глыток чароўнай Асьветы і ён прачхнецца, як тая казачная, спячая царэўна...

Бярыця пад увагу, што цяпер, то не раней... і ўсё павінна тварыцца скорым тэмпам...

Клічу вас к Жыцьцю!..

**Змітрок Бядуля.**

## Земство і воласць.

IV

**Воласьць.**

Што такое цяперэшняя вовласьць, ведае кожны селянін. Дзеля гэтаго гаварыць аб тым як яна нарыхтавана ня буду. Шмат нарэканьнеў на воласць ад усюль даводзіцца чуць. Ды і праўца ёсьць такі на што нарэкаць. Ні праўцы, ні толку, ні справядлівасьці, ні парадку у ей німа. Чаму гэтак? Перш на перш вінавата канешне народная цемната. Выбіраюцца у валасные начальнікі ня лепшые, справядлівые і талковые людзі, а тые хто, ці дзеля нажывы, ці дзеля гонару хочэ прайсьці у начальствады не шкадуе грамадзе гарэлкі. Далей беларускі селянін мала таго што цёмны, але ешчэ страшэньна баязлівы, запужаны. Векамі ад усюль перэнасіў ён гнёт, у адносінах да сябе паноў і начальства не бачыў ні толку ні справядлівасьці. Зжыўся дзеля таго народ з думкай, што німа праўды на сьвеці, што багацейшы і сільнейшы, калі толькі захочэ, заўсёды скруціць у барані рог беднаго і слабаго—усё роўна вінават той ці не. Аж надта добра на сваей скуры перэканаўся народ, што закон у воласці, як той дышэль, куды яго павернеш, туды ён і вышоў—і для сільных закон ня пісан. Не знае народ сваіх правоў. І ня ўмее бараніць сваіх правоў, тых што дае закон і як на тое пахілае дрэўца-на каторае, як кажэ прыказка «і козы скачуць», так с селянскай цемнаты кожны карыстае. Лупюць скуру з народу і па закону і без закону — кожны хто ня леніцца. Валасное начальства, у нідаўные ешчэ часы, гэткіе выробляло штучкі з валаснымі грашміды і ня толькі з імі—што ажно паверыць трудна. Выробляліся такіе штучкі дайжэ што не спатыкаючы — атпору са стараны пакрыўджэнай грамады. Цяпер ужо ня тое. Цяпер у валасьці часта гэткіе спраўкі і на верх вылазюць. Находзюцца людзі, што выводзюць зладзействы і здірствы на чыстую воду. Ня гэтак ужо даецца стрыгчыся народ, як даўней, але усё такі надта многа брыды робіцца па валасьцёх ешчэ і цяпер. Прытым калі і скінуць напр. злодзея хабарніка старшыну, дык на яго мейсцо выбіраюць ня лепшаго, а ці гэткаго самаго ашуканца, ці дурня.

Акром цемнаты, у гэткай пастаноўцы валасных спраў, вінавата, тое што на воласьць народ глядзіць як на казённую установу і карысьці ад яе ня жджэць. Яно

## Чаму?

Гляджу я с прыгорку на ціхую вёску,
Усю пачарнеўшую ад непагод,—
Гляджу на плакучую сумна бярозку,
Павіслую сумна ка мне цераз плот...

Самотны мы з ёю — ўкруг вецер гуляе
І кідае, круце нас з боку на бок...
Чаму-ж ты бярозка ня вырасла ў раю?
Чаму-ж я жыву увесь век адзінок?

Там далей віднее вясёлая хатка,
Ля хаткі—кабета і дзеткі яе;
Чаму, ах, чаму-ж не мая гэта матка,
А тые дзяўчынкі—ня сёстры мае?

**К. Бор—іч.**

* *
*

Разгані па небі,
Вецер, цёмны хмары,
Разнясі па полі,
Мае сумны думы.

Уздыхаюць цяжка
Ад іх мае грудзі,
Ныіць маё сэрцэ
І баліць бязьмеры.

Вяну я ад думак,
Як былінка ў полі,
Не жыву—марнею,
Як птушка ў няволі.

Ох, зляціця думы,
Дайця мне прастору,
Сіле маладое
Дайця толькі волю.

І знайду я шчасьця,
Будзе жыцьце ў згодзе.
Зару новай долі
Відна на усходзе.

**Міхалка Скарэўскі.**

У Вільні у гэту пятніцу (13 чэрвеня) у залі Палескаго клюбу адбудзецца Концэрт-Баль на карысць студэнтоў Літвіноў. Паміж іншым будзе пеяць вялікі хор—60 чэлавек—пад загадам вядомаго артысты-композытора ¡Ст. Шымкуса, каторы у сваім часе вёў у Пецярбурзі хор беларускі.

Пачатак роўна у 8 ½ г. веч. Цэна білетоў ад 5 руб. да 50 к. У часе ігры на сцэні дзьверы у залю будуць зачынены.

# З Беларусі і Літвы.

## З Віленшчыны

### Тэлефон с Пецярбурга у Вільню і Варшаву.

Хутка пачнуць будаваць тэлефон с Пецярбурга у Вільню і Варшаву. Закончуць работу за якіх 2—3 гады. Гэткім парадкам, знаёмые, тые што у Пецярбурзе, будуць магчы гаварыць са сваімі знаёмымі у Вільні і Варшаві і наадварот.

= У **Буцлаве** (Вілейск. пав). У часе буры пярун ударыў у двох дзяўчын. Дзеўчаты былі у лесі на забаві і, як пачаўся дождж, яны пачалі бегчы дамоў і на бягу ударыў у іх пярун. Адну дзяўчыну на мейсцы забіў,— другую пакалечыў цяжка.

= У вёсцы **Шыковічах** (Вілейскаго пав., Мядзельскай вол.), пярун забіў 18 гадоваго хлапца Юстына Звяругу, у той час, калі той вёў с пашы дамоў каня.

= У дварэ Хораве, памешчыка Хэлхоўскаго згарэла 18 дзесяцін лесу.

= У **Смаргонях** у часе буры пярун забіў работніка М. Сырая. Сырай у буру быў у сваей хаці.

= Згарэло ў шчэнт мястэчка **Васілішкі**. Агонь зніштожыў 100 сяліб і многа жывёлы.

**Падбродзьдзе.** (Свенцянск. пав.).

У Падбродзьдзі с 1 чэрвеня будуць прадавацца беларускіе кніжкі: у кнігарні Б Ліфшыца, у газэтным кіоску, і газэтчык будзе насіць «Нашу Ніву» па дачах і па рынку у кірмашовые дні

Ня шкодзіло-б, каб па ўсіх мястэчках чытачы «Н. Нівы» спрабавалі устроіць прадажу беларускіх газэт і кніжэк. Гэта каштуе усяго 1 р. 50 к. на гэрбавые маркі. Пазваленьне на адно мястэчко дае спраўнік, а на некольki мястэчэк трэба прасіць пазваленьня у губэрнатара. К прашэньню да губэрнатара трэба прыкладаць і валасное, ці паліцэйскае сьвідзецельства аб благонадзёжнасьці.

Працуйця, чытачы, бо калі цяпер пачалі самі селяне касаваць манапольki, дык трэба на мейсцо атруты даць нешта лепшае народу. А гэтае лепшае пачынаецца з газэты, з друку шчыра-народнаго. Народу вельмі патрэбна духоўная страва. а такую пасільную страву селянін знайдзе толькі у кніжцы і газэці у роднай мове.

*Чалееускі.*

### Скасаваньне манаполяк.

Манькоўскай воласьці (Свенцянск. пав.) валасны сход прыгаварам пастанавіў скасаваць абедзві манапольki: Манькоўскую і Груздоўскую, і, як кажуць, ужо і зацьверджэньне прыйшло.

У гэтай воласьці цяпер зусім німа ні манаполек, ні піўных.

Пішыця, чытачы, што робіцца у вас з гэтай народнай атрутай. Хутчэй рабіця прыгавары і касуйця манапольki. *Чалееускі.*

## З Міншчыны.

### Мінск.

У Мінску скончылася нарада у справе змаганьня с пьянствам. Прызналі, што канечна трэба паклікаць у помач самаўпраўленьня—земскіе, гарадзкіе і валасные, і пастаноўлена установіць па вёсках старшын, каторые бы сачылі за пьянствам і патайнай прадажай гарэлкі. Пры гэтым высказаліся, што трэба з вялікай асьцярогай закрываць манапольki, каб не закаранілося патайнае шынкарства, с каторым змагацца дужа пяжка.

= У в. **Азёры**, Мінск. губ. селяне пастанавілі закрыць манапольку. Проці гэтаго прыгавару дужа востра выступіла дачка манапольшчыцы Н. Сайкоўская, баючыся, каб матка яе не асталася бяз мейсца. Узяла і напісала просьбу у губэрнскае праўленьня, каб манапольki не закрываць. На гэту прозьбу яна сабрала многа подпісоў, найбольш — падросткоў. З губэрні пакуль што німа атказу.

= У **Новагрудку** пад кірункам паветоваго шляхоцкаго маршалка, на нарадзе, сабранай у справе ацьвяразеньня народу, паміж іншым ураджэна, старацца перэд правіцельствам, каб зменшыло акцызу на цукер, а такжэ, каб нейкі працэнт грошы, ад прадажы гарэлкі правіцельство аддавало земствам на змаганьня с пьянствам.

= У в. **Калачы**, Ігум. пав. пастанавілі селяне зачыніць манапольку.

= У в. **Мікулічы**, Рэчыцкаго пав., селяне прыгаварам пастанавілі закрыць піўную.

= У в. **Веляцічы**, пастанавілі селяне прыгаварам ва ўсей воласьці пазакрываць на заўсёды уселякіе шынкі і гандлі ап'яняючымі напіткамі.

= У **Новагрудзкім** павеці шырыцца пошэсць **«яшчур»**. У в. Новая Мыш захварэло на яшчур 15 кароў, у Белаполі 50, а ў Дарэўнай 400 штук.

= У в. **Тамашэвічах**, Мозырскаго пав. згарэло 83 будынкі.

= Жыхары **Сьвержэнскай** вол., селяне робяць старэньня каб ім пазволілі аткрыць у мястэчку Сьвержэні сельска-гаспадарскі кружок.

= У ігуменскім і бабруйскім паветах вялікая бура з градам нарабіла многа шкоды. Адзін селянін у Барсукох, забіты пяруном.

гаварыўся з усім «обчэствам» і што раз болей набіраючыся рэзону, якбы не раўнуючы, паміж сваіх сяброў, пачаў жартаваць і, прыказкамі перэплетаючы свае жарты, выводзіў вельмі салённые і разумные рэчы. Усе мы так сама паказалі від, што з радасьцю слухаем яго, (і ткі папраўдзі скажу вам, што усе мы добра растапырылі вушы), апрыча «сынка», каторы на той час чырванеў і усё перэбіваў бацьку:

— Ды годзі табе, калі выпіў, то не расходзься, дый зараз чугунка прыбудзе. . Ехаць хіба, што пара табе..

— Ой, сынку, сынку! Здаецца мне, што ..— (хоць ты злуй ня злуй, што буду на цябе *«ты»* казаць),—здаецца мне, што цябе, цэлаго цябе я на скрось і бачу, як пэркалёвенькаго і бачу я там, у цябе ў сярэдзіні, што любіш ты усё-ж такі і мяне і маці тваю і сястронак. ды толькі... толькі .. Эх! і гаварыць ня буду! А мо мне і па праўдзі толькі так здаецца? Але кажу табе, што ня лёгка у мяне на сэрцы. Маці, тая бедная...

Тут у нашаго старога паліліся сьлёзы. Вучыцелькі таксама прылажылі хусьцінкі да твары, а сынок завярнуўся і пашоў с хаты:

— Мне,—кажэ,—на службу пара. Глядзі, каб на чугунку не апаздаў, а 10 гадзіне пойдзе,—звярнуўся ён да бацькі, а пасьля да мяне кажэ:

— Вы Іосіф Піліпавіч не забудзьця жэнскі пэрсанал правесьці да хаты.

— Ці-ж табе па праўдзі на службу?—запытаўся я.

— Не, бачыш, я абецаўся за таварыша дзяжурыць. — І пашоў ён.

Бацька тым часам перэстаў плакаць і, глянуўшы на ўсіх нас, кажэ:

— Шак-ж вучыў я яго, выкладаючы апошніе пажыткі свае: каня прадаў аднаго, пасьля другога. А як лясьніком восем дзён*) служыў, то й хату новую на два канцы выбудаваў і тую прадаў на навуку яго, пасьля апошнюю кароўку прадаў. Чэкалі пацехі!.. Цяпер, як, бачыце выўчыўся, жыве нішто... От, абы жыў—здароў, і то слава Богу.. Здаецца, каб прыехаў ён хоць раз... Каб цяпер хаця мог паехаць—мо тая маці з радасьці паправілася-б...

Тут стары сьціх і доўга, доўга маўчаў, спусьціўшы галаву. Усе, колькі нас было, так сама доўга маўчалі

— Э-э- эх! — прарвалі цішу некаторые.— Так-то на сьвеці бывае!

— Што і гаварыць,—ажывіўся стары,— каб мне, здаецца, тая навука, што сынку майму дадзена, я бы ўвесь сьвет на свой капыл перэрабіў-бы. Як служыў гэта я 8 дзён лясьніком, выйдзеш, бывало, летам, ці вясной, часамі, ў свой абход, ідзеш, ідзеш борам густым; птушкі пяюць на розные галасы, сосны ды ёлкі шапацяць таемным гоманам, пчолы у ягадніку зыдуць... А на ўсё гэта сонцэ залатое апушчае свае косы і туліць і грэе, здаецца, ўсю зямельку, ўвесь бор, і ўсё жывое разам, як тая птушка дзяцей сваіх пад крылом пуховым.. Ходзіш, ходзіш, і думаеш. Чаго не перадумаў я за тые восем лет па лесі ходзючы?! Каб здаецца во гэтые пальцы грубые, ды маглі пяро ўтрымаць!.. Каб я ды граматны быў!.. Э-э-эх! Ня тое выходзіць. Сынок, сынок, — думаў часамі.—вучыся, вучыся, сынок, бо я не такі, як твой дзед, мой бацька, значыць... Ага, вось на мысль прышло: мой бацька адзін раз вельмі моцна выбіў мяне, але так моцна, што і цяпер баліць.. За што? Як вы думаеця, — за што выбіў мяне бацька мой? А вось слухайця: У нашым сяле вучылішчэ было. Бацька мяне не хацеў вучыць. А мне ўжо гадкоў 13 было. Я гэта аднаго разу уцёк с хаты, ды да вучыцеля тога. Даражэнькі, кажу, родненькі, я хачу вучыцца, а бацька мяне ня хочэ аддаць вучыцца, прымеця мяне, кажу, у школу. Што-ж, кажэ, садзіся, а заўтра я пагавару з бацькам тваім. Цэлы дзень праседзіў я ў вучылішчы. Прыходжу да хаты: Ты дзе быў?! У школі, кажу. Як возьме бацька дубец, як пачне мяне хрысьціць: во табе, кажэ, школа, во табе навука!.. Аж цяпер помню, і баліць.. Так і стаўся цёмны як бор той у даждлівую, восеннюю ноч. Шуміць бор ад ветру. Шуміць, а цёмны ён... Э-э-эх! Сынку, сынку!".

Стары зубамі скрыпнуў. Пасьля сам сабе наліў гарэлкі, выпіў, пасьля ешчэ раз наліў і выпіў і зноў кажэ:

— Я, бацькі мае, дзяды мае. жылі у вёсцы у лесі..—А сыны нашы жывуць у гарадох і курортах. Я, і дзяды мае правілі лейцамі, калі ехалі. або гаралі, або баранавалі,—а сыне нашы, правяць паездамі, караблямі, аэрапланамі.. я і дзяды мае, рэдка калі цікавіліся горадам і яго выдумкамі,—і затое мусяць сынэ нашы рэдка каторые цікавяцца вёскай і бацькамі сваімі...

Памаўчаўшы і пасьля з усьмешкай, горкай усьмешкай на зморшчэнам твары сваім, зьвярнуўся ён да нас:

— Хіба, што так і быць павінна?

Мы ня мелі чаго адказаць яму.

Выпілі ешчэ і ешчэ і стары наш, кажучы, што ня хочэ больш гасьціць тут, сабраўся ехаць. Замест праводзіць «жэнскі пэрсанал», я праводзіў гасьця нашаго. Прыйшоўшы на станцію стары запытаўся, гдзе гэта сын яго,— я паказаў на дзьверы.

Скора за дзьверамі я пачуў крыкі таварыша:

— Тут уходзіць часным ліцам не палагаецца! Я атвечаць буду за гэта.

Але бацька чамусьці не паслухаў сына.

Раздаўся званок, прыйшлі старажы.

— Вывясьці гэтаго пьянаго!!! Крычаў таварыш, як ашалеўшы.

Старычка вывялі, і дзіўна: замест злосьці ці крыўды на яго зьбялеўшым ужо твары была горкая усьмешка, тая самая усьмешка, з якой пытаўся ён у цэлай кампаніі за сталом:

— Хіба, што так і быць павінна?

Скора таварыш мой папрасіў перавод і выехаў ешчэ за 700 вёрст далей.

**І. Піліпоў.**

*) Восім гадоў — значыць, — то ў яго ужо прыказка такая.

**Паварот эмігрантоў.**

С прычыны безрабоцьця у Амэрыцы, многа селян, што былі паехаўшы у Амэрыку ужо два-тры гады таму, цяпер варочаюцца назад.

**Нагрaда «Сасе».**

На сельска-гаспадарскай выстаўцы у Мінску, беларускую сельска-гаспадарскую часопісь «Саха» нaградзілі малым сярэбраным мэдалям.

**Вёска Крупіца**, Мінск. губ. і пав., Самахвалавіцкай вол.

У нашым сяле ёсьць манаполька. Ведама, што яна нам шкодна, бо некаторые крупічане, маючы пад бокам такую пакусу, ня ўрымсьцяць, каб ня выпіць і, німа чаго таіць, часам добра глокаюць. Але крупічане, калі прыраўнуем іх да іншых, пьюць мала. Сьвятам сюды прыходзюць пьянчыцца з двароў і іншых сёл. Упіўшыся, лаюцца, бьюцца і пераймаюць людзей па дарозі, нават раз свайго пана хацелі пабіць. Ужо дзеля аднаго гэтаго нясупакою казалі крупічане, трэ скасаваць манапольку. Парадзіўшыся, ўсе прышлі ў волосьць і прасілі старшыню с пісарам напісаці прыгавор, але тые пачалі ім адраджаць і напісаць яго адказаліся. Сядзелец-жэ, Тамаш Шакура, частаваў на другі дзень Вялікадня селян гарэлкай, просючы не закрываць манапольсі, бо гэтым ў яго адбяруць лёгкі хлеб (ён нават сваю хату аддае ў арэнду пад манапольку). Але селяне, выпіўшы гарэлкі, ешчэ больш загаманілі, што манапольскі ня трэба і напісалі ў Мінск губэрнатару просьбу, каб яе закрыць. Пад просьбай падпісалося безмала ўсё сяло. Пачуўшы аб гэтым, сядзелец рукі заламаў, галасіў, як матку пахаваўшы, і давай прасіць старшыню і памочніка самахвалавіцкаго пісара і свайго крупічанскаго пісара, Ламаку, падаць другую просьбу. каб пакінуць манапольку. Ламака напісаў просьбу, а брат сядзельца, Александар Шакура, хадзіў з ёю с хаты ў хату і прасіў падпісацца.

Але ня гледзячы на ўсё гэта, такі мы маем надзею — закрыць манапольку. *К. М.*

**М. Беларучы**, (Мінск. губ. і пав.)

На узгорку стаіць вёска Пунішчэ, а побач яе на высокай вышыне — Лысая гара (самае высокае мейсцэ у нашым краі). Невялічкіе гэтые вёсачкі, але цікавые.

Першае: у Пунішчы саўсім іначэй лаюцца, чымся у Лысай гарэ. Пунішчане клянуцца так: „каб цябэ рэзанка, каб цябе трасца“! Лысагорцы-ж клянуцца трохі лепш: «Каб цябе рэзь перарэзала, каб цябе пяруны, каб ты на ногі не паўстаў, ня ўзрос! і т. д.»

Далей: у Лысай гарэ адна шынкоўня, а ў Пунішчы цэлых тры. Калі раз я запытаўся у Лысагорцаў: «чаму у вас адна шынкоўня а у Пунішчы аж тры, — гэта-ж вам стыдна перэд пунішчанамі?» То мне атказалі: — «Э!.. Добра, што хоць адна ёсьць, а то, як не было вучылішча, то і ніводнай не было. Чашы, бывала, аж за тры мілі у Здэрэньне». Ну, думаю сабе, навука у лес ня йдзе.

Але гэта ўсё глупства: адна шынкоўня — якая тут можэ быць цікавасьць? Паглядзім лепш у Пунішчэ: тут мы можэм напаткаць такіе здарэньня, якіе і ў людаедаў трудна было-бы знайсьці. У Пунішчы нават і добрые людзі ёсьць, як хоцьбы Алёкса (глаўны шынкар). Ён, мае міленькіе, калі німа грошы, то і на павер дасьць паўкварту — другую, — разумеіцца, калі яго аб гэта далікатна і с пашанай папрасіць. Так, што па тутэйшаму ён чэлавек дужэ добраго і мяккога сэрца.

Вы можэ скажэця, што у Пунішчы вялікае пьянства, разбойства — саўсім не. Нават бывае, што цэлы тыдзень пройдзе саўсім спакойна. Ды пунішчане народ вельмі дэлікатны: калі што да чаго прыдзе, то яны не так, як жукаўцы ці там іншые зараз кольлямі або каменьнямі частуюцца, — крый Божэ! Пунішчане толькі ножыкі ў ход пушчаюць. Ціха сабе і спраўна пад бачок лізгануў і гатова. Ня верыце — паслухайце.

Неяк перэд запустамі я, лысагорскі вучыцель і пан Антоні (так яго і завуць) пашлі мы у Пунішчэ на вясельле. Вясельле як вясельле. Народу сабралася шмат: тут былі і жукаўцы, і лекараўцы і гаянцы нават і мяр ковічанцы. Пілі, гулялі, гулялі, пілі. Спачатку гулялі модные танцы: кракавяка, кадрылю і др., потым — польку, а як ужо добра патпілі, то пусьціліся лявоніху. Сваё такі забрало! А мой пан Антоні як расхадзіўся, то і ўпыну яму не было — аж у прысядкі прыседаў. Гэтак гуляюць усе... раптам: — «Братачка. за што? Што я табе зрабіу?.. Пацалуемся!.» — ды на двор, а за імі усе с хаты ррр!..

Выскачылі ўсе разам с хаты, а ў хату ўбегаюць па аднаму. Першы уляцеў сват Рыгор са славамі: «Браточкі. ратуйця! зарэжуць Мікалая.» А с самога так кроў і ліецца, як с парсюка: спаласавалі яму нажом патыліцу, шыю і наскразь пракалолі руку у локці. За Рыгорам ускочыў і Мікалай — ён нічога ўжо ня мог прагаварыць: Мікалаю наскразь прасадзілі абедзьве шчокі.

Назаўтрае нашлі аднаго забітаго (дзяцюк гадоў 18) і шмат аказалася да паўсьмерці параненых. Паехалі пакрыўджэные да урадніка з жалабай, каб прыехаў пратакол напісаць, а той ім: — «Як парэжэцеся ешчэ раз—тады я да вас паеду»! Павязьлі параненых да доктара. Доктар распытаўся, што і як, ды кажэ ім: — «Я толькі лячу людзей, а не зьвяроў».

Дык вось як у нас гуляюць вясельлі!

Другое такое было ў Пунішчы здарэньне. Адзін хлопец ажаніўся, пажыў троху з маладой жонкай, а пасьля стаў не ладзіць і кінуў яе. Аставіў жонку пры бацькох, а сам пашоў служыць. Там ён падладзіўся да аднэй дзяўчыны, каторая так сама служыла, угаварыў ей, што ён не жэнаты, абецаў жаніцца з ёй, і такім парадкам сркыўдзіў дзяўчыну і выдурыў ешчэ ў яе 50 рублёў сабе на адзежу к вясельлю. Дзяўчына усяму шчыра паверыла, а ён, узяўшы ад яе грошы, вярнуўся дамоў к сваей жонцы. Калі дзяўчына, не дачэкаўшыся яго, прышла, каб ісьці па пасьвячэне, то жэнаты жаніх разам са сваім бацькам і маткай зьбілі яе, бярэменную, да паўсьмерці і прагналі. Гэта было таму назад нядзелі са дзьве, а цяпер гэта дзяўчына — як казалі — ходзіць распусьціўшы валасы, як русалка, па лясох і галосіць, не знайходзючы сабе нідзе прыстаньня.

Жутка трохі, як падумаеш.

*Васіль Р—ч.*

# З усіх старон.

**У Думе.**

У Думе што раз робіцца пусцей. Дэпутаты раз'ежджаюцца куды каторы перад дакончэньнем сэссіі.

= Трудавікі падалі у Думу запытаньня с прычыны катаваньня арэштаваных у катаржных турмах.

**Змаганьне проці пьянства у войску.**

Ваенны міністр абвесціў наказ аб змаганьні с пьянствам у войску. У наказі гаворыцца, што начальнікі, начынаючы с самых высшых, павінны пачаць змагацца с пьянствам у даверэнных ім часцях.

**Прадаўжэньне сроку службы.**

Думская бюд'жэтная камісія прыняла праект закону аб прадаўжэньню сроку дзействіцельнай службы ніжнім чыном сухапутнаго войска на тры месяцы.

**Змаганьне з работнікамі.**

З Мітавы паведамляюць, што у звязку з апошнімі забастоўкамі, многа работнікоў высылаюцца з Мітавы на два гады, іншых ссылаюць у Сібір.

**У саюзніцкім багне.**

С Красноярска пішуць, што тамтэйшы аддзел палаты Міхаіла Архангела, арганізаваны сябрам Пурышкевіча. В. Орловым. саўсім разсыпаўся. У саюзі астаўся толькі таварыш прадседацеля—Андрэев, жалезна-дарожны сторaж. Праўленьне саюзу за кароткі час пасьпела нарабіць многа даўгоў, каторых цяпер німа чым плаціць. Быўшаго прадседацеля адзін саюзнік цягне цяпер у суд за доўг.

= Кастрамскіе заюзнікі паслалі у Пецярбург дэпутацію с просьбай пазбавіць поўнамочый прадседацеля тамтэйшаго саюзу руск. народу, нейкаго Ляпічова. Выявілося, што гэты Ляпічоў сядзеў тры гады у кастромскай турме за вялікую крадзеж. Ляпічоў ва ўсіх выступах верхаводзіў саюзам, прыймаў учасця у дэпутаціях і інш. Саюзьнікі цяпер дзівуюцца, чаму паліція пазваляла гэтаму злыдню прыймаць учасьце у часе юбілейных сьвят у 1913 г.

**Селянскі банк.**

Селянскі банк, як кажуць, калісь меў на мэці стаць у прыгодзі беззямельным і малазямельным селянам Але чаго благіе языкі не скажуць. З дзеяцельнасьці банка гэтаго відаць, што ён заўсёды найболей дбаў аб дваранство, каторых падтрымліваў, сцягнутымі ад селян за выкупы зямлі, грашамі.

Цяпер у Думу пададзен праект закону, каб селянскі банк даваў грошы на куплю зямлі асобам, каторые найменш 5 гадоў былі на гасударственнай службі. Гэты праект закону у першы чарод падпісан дэп. Чыхачовым і мае на мэці абдзяліць зямлёй у нашых беларускіх губэрнях усякіх абрусіцелёў.

**Афіцэрская «удаль».**

У Рызе кампанія афіцэроў пасьля гулянкі, хочучы пазухаваць перэд дамамі, устроіла а 5 гадзіне раніцай трывогу, і эскадрону гусароў загадалі у плаў перэпраівіцца праз Дзьвіну. Варочаючыся людзі і коні, дужа змучэные перэправай, былі аднесены вадой у глыбокае мейсцо, дзе шэсць салдатоў утапілося. Утапілося такжэ і некольскі коней. Каля дваццаці гусароў пакалечылося.

**Змаганьне с пьянствам.**

На зьездзі півавароў у Одэссі пастаноўлена рабіць стараньня перад правіцельствам, каб правіцельство піво залічыло не да ап'еняючых напіткоў, бо, як даводзюць півавары, пры помачы піва найлепей змагацца с... пьянствам.

Рэдактар-Выдавец
І. Луцэвіч.





Не купляйце парашкоу (попелоу—штучных гноеу) абы дзе па крамках, а купляйце там дзе прадаюць за справедлівую цэну добры тавар

у складзі **Віленскаго Таварыства Сельскай гаспадаркі.**

*Вільня, Завальная № 9.*

Купляйце хаурусна цэлымі вагонамі, тады абыходзіцца найтаней.

Там-жэ можна купляць усякую гаспадарскую прыладу.

!. Апошняе напомненьне !!

**Даступна кожнаму**

**купіць вучастак зямлі у ЗВЯРЫНЦЫ** у самай лепшай часці гор. **Вільні**. Мейсцовасць прыгожая, здаровая, лес, рэка. **Цэны і варункі выгодные. С купляй паспешайця**, зямлі асталося саўсім мала. **РУПЦЕСЯ — купіць можэця толькі у гэтым сэзоне.** Па спраўкі звертацца у кантору па прадажы вучасткоў у Зьвярынцы: Вільня „**Звярынец**“, Георгіеўскі праспэкт, д. № 68 Тэл. № 46. **Спраўкі выдаюцца праз цэлы дзень, не вылучаючы і сьвят.**


Друкарня Мырціна Кухты, Татарская 20.